# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА Е. С. СПІРЫДОНАВАЙ

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – чэрвень 1944 г.

**Месца дзеяння:**

в. Трыніўкі Віцебскага раёна, Чыгуначны раён г. Віцебска

**Колькасць:**

7 чалавек

**Кіраўнікі:**

Спірыдонава Еўдакія («Дуся», «Соня»)

Дзейнічала ў в Трыніўкі Віцебскага раёна і Віцебску з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Аб’ядноўвала 7 чалавек. Кіравала групай камсамолка, былая работніца панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ Е. С. Спірыдонава («Дуся», «Соня»). У групу ўваходзілі яе бацька Сцяпан Іванавіч, маці Марыя Сямёнаўна, сястра маці М. С. Бяляева, яе муж В. Т. Бяляеў, іх дзеці піянеры Рыгор і Пеця.

З моманту акупацыі горада фашыстамі Спірыдонава з бацькамі пасяліліся ў в. Трыніўкі, у доме Бяляевых, які стаў месцам канспіратыўных сустрэч падпольшчыкаў і сувязных. З лістапада 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам армейскіх разведгруп Ю. С. Рудакова («Ягора», «Жоржа»), з чэрвеня 1943 г. – М. Р. Яфімава («Армейца»), выконвала заданні 1-й Віцебскай партызанскай брыгады, Віцебскага падпольнага гаркама КП(б)Б. Члены групы збіралі разведінфармацыю, дастаўлялі падпольшчыкам горада міны, тол, лістоўкі, газеты, выводзілі з людзей па-за межы Віцебска.

У 1943 г. пры выкананні задання Спірыдонаў быў затрыманы фашыстамі і пасля жорсткіх пабояў памёр. У сакавіку 1943 г. карнікі расстралялі Рыгора і Пецю Бяляевых, у маі – В. Т. Бяляева. Еўдакія Спірыдонава падтрымлівала сувязь з групамі І. А. Бекішава, Т. А. Марудава, Б. С. Шарэнда, А. Я. Белахвосцікава і працавала над стварэннем новых падпольных груп. Дзякуючы яе намаганням узнікла падпольная група І. С. Вялава.

У канцы 1942 г. пры яе ўдзеле створана падпольная група на фанерным заводзе, якую ўзначалілі Р. І. Пушкароў, потым В. Ц. Шафранскі («Ігар»). У выніку дыверсій

увосень 1943 г. завод быў поўнасцю разбураны. Калі члены гэтай групы аказаліся пад падазрэннем, большасць з іх Спірыдонава вывела да партызан.

Пра Е. С. Спірыдонаву яшчэ ў вайну хадзілі легенды як аб вельмі смелай і знаходлівай разведчыцы. Быў выпадак, калі адна армейская група выкрала яе ў другой. Але Дуся працавала на ўсіх, для Радзімы.

Е. С. Спірыдонава ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, Пушкароў і Шафранскі – медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Е. С. Спірыдонавай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 497–498.

2. **Подпольная** группа Спиридоновой Е. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 296–297.